## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукционов** | Ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2 |
| **Продавец** | ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ», 212008, г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17/2, тел. 8 (0222) 72-77-72 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1. Объекты недвижимого имущества (составные части и принадлежности), расположенные по адресу:** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, 17, в составе:

| Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь |
|---|---|---|
| 700/С-3733 | **Здание цеха облицовочной плитки №2 с административными помещениями (доля – 8/15)** (Здание многофункциональное) | 5 948,6 кв. м |
| 700/С-7491* | **Здание административного корпуса (доля – 1/5)** (Здание административного корпуса) | 1291,0 кв. м |

**Составные части и принадлежности:** кабельные линии внутри здания; автомат повторного включения 1600а апв-5; кабельные линии связи; пожарная сигнализация офиса; приточно-вытяжная вентиляция; сигнализация; система видеонаблюдения; система электроснабжения; счетчики электроэнергии – 8 шт., видеонаблюдение склада; кран мостовой двухбалочный г/п 3,2 т; складское оборудование; стеллаж – 1; стеллаж; сторожевая будка; металлическое ограждение с воротами и калиткой; ограждение площадки для производств.; ограждение площадки – 1; ограждение площадки – 2; площадка, прилегающая к цеху; пропускной пост; система пожарной сигнализации цеха; сторожевая будка 2; таль; стеллаж

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Объекты недвижимого имущества расположены на двух земельных участках: участок (для содержания и обслуживания здания цеха) площадью 0,8615 га (доля 21/50, право постоянного пользования), участок (для содержания и обслуживания здания административного корпуса) площадью 0,0440 га (доля 1/5, право аренды по 20.12.2021) |
| **Сведения об обременениях** | **Арендаторы.** Подробная информация по телефону +375(44)729-46-60, e-mail: jurist@sktzpt.by, Бураков Андрей Петрович |
| **Начальная цена** с НДС 20% | **338 620 руб. 00 коп.** |
| **Шаг** аукциона | **16 931 руб. 00 коп.** |
| **Задаток** | **2 000 руб. 00 коп.** |

**Срок подписания договора купли-продажи:** 1 день после проведения аукциона

**Срок оплаты:** в течение 1 дня со дня заключения договора купли-продажи

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» 07.10.2017, 19.10.2017, 31.10.2017, 15.11.2017 (*в извещениях допущена опечатка: вместо инв. №350/С-100401 читать инв. 700/С-7491)

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **22 декабря 2017 г. в 11.00** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, офис ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **19 декабря 2017 г. до 18.00** г. Могилев, 4-й пер. Мечникова, д. 17/2, ликвидационная комиссия ООО «Служба комплектации трубопроводов ЗПТ» |

**Задаток** перечисляется на р/с BY24 PJCB 3012 3008 8110 1000 0933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев код банка (БИК) PJCBBY2X. Получатель – ООО «СКТ ЗПТ», УНП 790104272. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «СКТ ЗПТ»

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления с предметами аукционов** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется с 8.00 до 17.30 (понедельник–пятница) по предварительному согласованию по тел. +375 (29) 631-19-51, Максим Александрович |

**Порядок оформления участия в аукционах и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина Республики Беларусь от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение о задатке. Информацию о документах, необходимых для участия в аукционе, порядке его проведения, оформления результатов вы можете получить по телефону +375 (44) 729-46-60, e-mail: jurist@sktzpt.by, Бураков Андрей Петрович.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контакты** | +375 (29) 631-19-51, +375 (44) 729-46-60, +375 (29) 112-28-43, jurist@sktzpt.by |



Standard.by

**ООО «Центр эксперт-услуг» (организатор аукциона) проводит повторный открытый аукцион**

По продаже: капитального строения (здание специализированное для общественного питания) с инвентарным номером 323/С-20414, общей площадью – 837,4 кв. м, расположенного по адресу: Гомельская область, г. п. Корма, ул. Илющенко, д. 4а, на земельном участке с кадастровым номером 322555100001001830 площадью 0,1166 га, предоставленном на праве постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством.

Начальная цена продажи – 70 080,00 (семьдесят тысяч восемьдесят) рублей с НДС;

Шаг аукциона – 5% от начальной цены продажи;

Задаток – 10% от начальной сцены продажи;

Задаток перечисляется на расчетный счет BY98PJCB30124035171000000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК PJCBBY2X, УНП 491058984, получатель платежа ООО «Центр эксперт-услуг», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 09.12.2017 г.

Аукцион состоится 27 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 26 декабря 2017 г. до 14.00 по указанному адресу.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация о предмете аукциона размещены на сайте **auction.standard.by**.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5%, обязан:

в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить лицу (Заказчику или Исполнителю в соответствии с договором), понесшему затраты на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений, подготовку и публикацию рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам, в случае повторного выставления объекта на аукцион и определяется на основании представленных документов; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Заказчиком договор купли-продажи объекта недвижимости (далее договор купли-продажи); произвести оплату за объект недвижимости в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Результаты аукциона подлежат аннулированию организатором в случае, если победитель аукциона уклоняется или отказывается в установленные сроки от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением аукциона.

Тел./факс: +375 (232) 21 21 61, + 375 (29) 303 39 33.

По вопросам осмотра имущества тел. +375 (44) 784 36 54.

E-mail: info@standard.by


# ПАМАЛІЦЦА НА ВЫШЫНІ І ЎБАЧЫЦЬ «ДУШУ»...

**На Захадзе Украіны, на мяжы з Малдовай, на вышыні больш за 100 метраў ёсць скальны манастыр, узрост якога больш за ўзрост Кіева-Пячэрскай лаўры. А яшчэ ў краіне-суседцы знаходзіцца самы вялікі ва Усходняй Еўропе музей хатняй іконы і прадметаў быту мінулага. Яго яшчэ называюць «Душа Украіны». Усё гэта журналіст «Звязды» атрымаў магчымасць убачыць дзякуючы прэс-туру, які быў арганізаваны Міністэрствам эканамічнага развіцця і гандлю Украіны і Кіеўскім прэс-клубам.**



Лядаўскі скальны мужчынскі манастыр.

## ПАМІЖ АФОНАМ І КІЕВАМ

Нядаўна адной з найбольш абмяркоўваемых навін стала інфармацыя пра тое, што Украінская праваслаўная царква атрымала незалежнасць ад Маскоўскага патрыярхату. Навіна гучная, але, калі ўнікнуць, па сутнасці мала што памянялася: Украінская праваслаўная царква, гэтак жа як і Беларуская праваслаўная царква, была і застаецца самакіравальнай часткай Маскоўскага патрыярхату. Унесеныя змены носяць тэхнічны характар: цяпер у статуце Рускай праваслаўнай царквы асобна прапісана, што цэнтр кіравання Украінскай праваслаўнай царквы знаходзіцца ў Кіеве. Усе гэтыя нюансы, насамрэч, мала хвалююць людзей, якія шукаюць свой шлях да Бога. Пра гэта казалі і манахі Лядаўскага Усекнавенскага скальнага мужчынскага манастыра, які знаходзіцца ў Вінніцкай вобласці Украіны.

Манастыр адносіцца да Магілёў-Падольскай епархіі Украінскай праваслаўнай царквы. Яго ў 1013 годзе заснаваў родапачынальнік манаства на Русі прападобны Антоній Пячэрскі (у свеце — Анціпа). Побач невялікая рэчка Лядава ўпадае ў Днестр. Усекнавенскі — бо ў гонар усекнавення галавы Іаана Прадцечы. Аднайменную ікону ў манастыры ўшаноўваюць асабліва. Як і крыніцу з вадой, карыснай для здароўя. Лічыцца, што яе знайшоў і добраўпарадкаваў сам прападобны Антоній. Вернікі канстатуюць, што вада з крыніцы мае гаючую сілу. Асабліва шануюць тут і камень з надпісам пра тое, што мясціна знаходзіцца пад аховай Бога.

Манахі расказалі, што малады манах Антоній, паплечнік вялікага роўнаапостальнага князя Уладзіміра — хрысціцеля Русі, — па дарозе з Афона ў Кіеў менавіта ў гэтым месцы пачуў голас нябесны. Таму вырашыў спыніцца і высек у скале келлю, якая захавалася. Яе памеры такія ж, як і ў манастыры на Святым Афоне, дзе Антоній прыняў манаскі пострыг. З келлі ўглыб скалы вядзе пераход, адзін з некалькіх.

Многіх прыезджых таксама ўражвае і костніца — астанкі манахаў. Калісьці была такая традыцыя і не толькі ў хрысціянстве — выстаўляць чэрапы і косці памерлых напаказ.

## І ХМЯЛЬНІЦКІ, І КАРБЫШАЎ

Цікава, што менавіта гэты манастыр мае непасрэднае дачыненне да ўсім вядомай гісторыі пра ўзаемаадносіны Багдана Хмяльніцкага і Рускага царства. Манахі расказалі, што ігумен Павел і іераманах Нічыпар перадалі грамату іерусалімскаму патрыярху Паісію, а таксама агучылі просьбу цару Аляксею Міхайлавічу дапамагчы ў барацьбе з ворагамі. Нагадаю, гэта адбылося ў 1648 годзе.

У XVIII стагоддзі манастыр належаў уніятам. У сярэдзіне XIX стагоддзя ў ім пачаўся перыяд росквіту. Браты вялі актыўную асветніцкую і гаспадарчую дзейнасць. Праводзілі і кірмашы, на якія прыязджала шмат людзей.

1938 год — сумны ў гісторыі манастыра. Тады на мяжы з Румыніяй пачалі будаваць сакрэтную лінію абароны. Кіраваў гэтым генерал Карбышаў. Адно з абарончых збудаванняў вырашылі размясціць на тэрыторыі манастыра. Апошні было загадана часткова зруйнаваць.

Манахі расказалі падчас экскурсіі, што той, хто заклаў выбухоўку, загінуў. Перад гэтым пачуў спевы ў суседнім храме, дзе людзей не было. Многае было знішчана. Выбух быў настолькі моцны, што потым відавочцы гаварылі пра разарваны купал і галоўны звон манастыра, якія ўляцелі ў Днестр.

## СВЯТЫНЯ ВЯРТАЕЦЦА

Адраджэнне пачалося каля 20 гадоў таму. На сёння ў манастыры жывуць 10 чалавек. Пра нюансы жыцця яны шмат не расказваюць. Праўда, адзін прызнаўся, што не ўсе вытрымліваюць нялёгкія ўмовы побыту... Таму некаторыя жывуць тут часова. Тыя, хто затрымліваецца, навучаюцца апрацоўваць камяні, рабіць мазаіку. Ёсць свае іканапісцы. Усе яны пры дапамозе паломнікаў і тых, хто шануе гісторыю краіны, адбудоўваюць страчанае. Вырашылі, што адновяць усё! На тэрыторыі манастыра і там, і тут рыштаванні, будаўнічыя матэрыялы.



Самы вялікі ва Усходняй Еўропе музей іконы.

Як і калісьці, тут праводзяць кірмашы. Размяшчаюць паломнікаў. У царкоўнай лаўцы можна купіць іконы, нацельныя крыжыкі, праваслаўную літаратуру.

Нават турысты, далёкія ад Царквы, пры першым поглядзе на манастыр на гары адчуваюць трапятанне ў душы. Калі падымаюцца наверх да збудаванняў, дзіўнае пачуццё толькі ўзмацняецца...

Ды і краявід з вышыні варты таго, каб пераадолець сотні або тысячы кіламетраў да святых мясцін. Дыхаецца тут лёгка, і на свет пачынаеш глядзець інакш — адчуваеш сябе птушкай. Манахі могуць з некаторымі турыстамі і пагаварыць, нешта параіць.

## ДРУКАРНЯ, МЛЫН, СМЕТНІК, МУЗЕЙ

А ў гарадку Радамышль Жытомірскай вобласці журналістам паказалі прыватны музей, дзе сабраныя іконы розных хрысціянскіх канфесій і прадметы быту.

Як падкрэсліла экскурсавод, з дзяржаўнага бюджэту дапамога не аказваецца. Зарабляюць на продажы білетаў і за кошт правядзення розных культурных акцый.

Музей украінскай хатняй іконы і старажытнасці з'явіўся дзякуючы вядомаму ўкраінскаму палітыку Вользе Багамолец. Яна — кіраўнік камітэта Вярхоўнай Рады Украіны па пытаннях аховы здароўя, дарадца прэзідэнта краіны па гуманітарных пытаннях. Была кандыдатам у прэзідэнты на выбарах 2014 года. Мецэнат, заслужаны ўрач Украіны, доктар медыцынскіх навук. А яшчэ — праўнучка акадэміка Аляксандра Багамольца, кіраўніка АН УССР, віцэ-прэзідэнта АН СССР. Ён — аўтар сістэмы захавання донарскай крыві, а таксама сывараткі, якая паскарае гаенне ран.

Вольга Багамолец, каб размясціць сваю багатую калекцыю, шукала будынак. Выбар выпаў на млын, пабудаваны ў 1902 годзе. Каля 20 гадоў таму тут была звалка — ні вокнаў, ні дзвярэй, на вачах разбуралася ўзведзенае продкамі...

Пачалі наводзіць парадак. І высветлілася, што млын стаіць на рэштках падмурка больш старажытнай пабудовы. Там у XVII стагоддзі выраблялі паперу для Кіева-Пячэрскай лаўры. Дарэчы, нават раён горада мае назву «Паперня». Таксама аказалася, што будынак узведзены на падземнай гранітнай скале...

Сярод каля пяці тысяч ікон, скульптур, а таксама прадметаў быту ёсць і шкляныя. Уражвае ікона XII стагоддзя. Да яе можна дакрануцца і адчуць... цяпло — літаральна, а не ў пераносным сэнсе. Напэўна, захоўвае энергетыку людзей, якія дакраналіся да яе на працягу вякоў.

## І МАЙСТАР-ШОУ З XVII СТАГОДДЗЯ

Афіцыйнае адкрыццё гісторыка-культурнага комплексу «Замак Радамышль» адбылося ў верасні 2011 года. А ў наступным годзе была адкрыта адноўленая лінія вытворчасці паперы па тэхналогіі XVI—XVII стагоддзяў. Паперу рабілі з лёну, крапівы і канопляў. І дадавалі шалупінне часнаку (абараняла ад шкоднікаў) і цыбулі (надавала трываласці). Экскурсанты пры дапамозе друкара могуць навучыцца наносіць малюнкі на паперу, аналагічную старажытнай...

Падчас рэстаўрацыі тут аднавілі інтэр'еры XVII—XIX стагоддзяў. Да асноўнага будынка дабудавалі вежу вышынёй 35 метраў. І на ёй усталяваны звон. У комплексе ёсць канцэртная зала. Яе ўнікальнасць у тым, што яна адзіная ў свеце, дзе ёсць крыніца. Вада трапляе ўнутр праз расколіны ў скальнай пародзе. Ёсць і абрадавая зала, дзе заключаюцца шлюбы, праводзяць важныя мерапрыемствы. Выкарыстоўваецца і трапезная. Для турыстаў ёсць гатэль.

У ландшафтным парку з двума вадаспадамі, выспамі, рэдкімі раслінамі можна ўбачыць старадаўнія скульптуры XVII—XIX стагоддзяў. Тут нельга абмінуць масток мары, каб патрапіць на востраў шчасця.

Комплекс — частка агульнаеўрапейскага культурнага праекта Via Regia, заснаванага Саветам Еўропы. Мэта праекта — спрыяць культурнаму абмену і развіццю турызму паміж еўрапейскімі краінамі.

Падчас прэс-туру нам таксама паказалі месца, куды прыязджаюць экстрасэнсы, каб «зарадзіцца», распавялі пра таямніцы «масонскага парку», пазнаёмілі з экспанатамі бурштынавага музею і яшчэ шмат з чым. Пра ўсё гэта — у іншых нумарах «Звязды».


**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*


*Вінніцкая і Жытомірская вобласці Украіны.*